**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2019 г.

У ліпені ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання «Канікулы ў бібліятэцы». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання «Летом с книгой я дружу»

***1 ліпеня***

«Интересно и полезно» – пад такім дэвізам адбылася сустрэча ў летняй чытальнай зале. Юныя чытачы прынялі ўдзел у пазнавальнай праграме «Однажды летом» і конкурсе на веданне дзіцячых кніг і мультфільмаў «В стране Мульти-Пульти». Дзеці чыталі ўслых «Сказку о золотом петушке» А. Пушкіна, а ў творчай майстэрні «ОчУмелые ручки» вучыліся рабіць закладкі ў кнігі.

Арэхаўская ПБ, 25 чал.

***4 ліпеня***

У бібліятэцы прайшла літаратурна-гульнявая праграма для дзяцей «Мы с друзьями не скучаем, а играем и читаем». У падарожжы па лету прысутныя гулялі ў гульні, адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў конкурсах, завіталі ў госці да Кікімары, якая падрыхтавала для іх сустрэчы з ляснымі жывёламі і шмат цікавых заданняў на грыбной, кветкавай, экалагічнай палянках. У бібліятэцы аформлены куточак з настольнымі гульнямі і кнігамі-гульнямі «Играй, считай, разгадывай», падрыхтавана кніжная выстава «Мир сказок – мир чудес».

Буховічская ПБ, 30 чал.

***8 ліпеня***

Літаратурна-спартыўнае свята «Моладзь за здаровы лад жыцця» бібліятэкар правяла на свежым паветры, пляцоўцы каля бібліятэкі. Вядучая прапанвала старшакласнікам літаратуру пра здаровы лад жыцця, правяла дыспут пра асноўныя складальнікі здаровага ладу жыцця, пра шкоду алкаголя, наркотыкаў, курэння. Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў спартыўных гульнях «Хто першы», « Здаровая ежа» і інш.

Магдалінская ПБ, 19 чал.

***11 ліпеня***

На казачнам дыліжансе «Расскажу-ка вам, друзья, что читал сегодня я!» рабяты здзейснілі падарожжа па старонках кніг выставы «Все сказки в гости собрались», завіталі ў госці да любімых герояў на прыпанках «Сказочная», «Зоопарк», «Сказки – наши друзья», дзе адгадвалі казачных

герояў, разгадвалі красворд, чыталі творы дзіцячых пісьменнікаў, успаміналі рускія народныя казкі.

Гарадзецкі філіял, 36 чал.

***25 ліпеня***

На гадзіне разважанняў «Огненная стихия. Помощь рядом» дзеці пазнаёміліся з мабільным дадаткам «Помощь рядом», якое дапаможа зарыентавацца ў экстранных сітуацыях, правільна зрабіць першую дапамогу, даведацца пра неспрыяльную ці небяспечную прыродную з'яву. З акцыяй «Ярмарка безопасности» ў мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі Кобрынскага РАНС. Бібліятэкары падрыхтавалі тэматычныя загадкі, інтэлектуальную віктарыну па тэхніцы пажарнай бяспекі «Не шути с огнём!».

Стрыгаўская ПБ, 29 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

***2 ліпеня***

Гасцямі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Зямля бацькоў – зямля святая», прымеркаванай да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, сталі падапечныя дзённага знаходжання дзяцей-інвалідаў Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Францыск Скарына, Еўфрасіння Полацкая, Янка Купала, Якуб Колас – госці ўспаміналі вядомых дзеячаў зямлі беларускай, якія ўнеслі важкі ўклад у культурнае развіццё нашай краіны, фарміраванне нацыянальнасці. Здзейснілі падарожжа па вядомых мясцінах Беларусі, адкрылі для сябе мноства цікавых фактаў пра гісторыю, культуру і архітэктуру краіны. У канцы мерапрыемства прысутныя прынялі ўдзел у віктарыне «Твая зямля, твая радзіма».

*(Кобрынскі веснік. – 2019. – 10 ліп. – С. 4)*

ЦБ, 28 чал.

***4 ліпеня***

У час выступлення ЛПГ «Беларусь мая, ты стала зноў прыгожай і свабоднай» пад музыку ваенных гадоў гучалі вершы са зборніка паэтаў Кобрыншчыны «Свет Великой Победы», ўспаміналі пра франтавікоў-аднавяскоўцаў. Біблятэкар правяла агляд кніжнай выставы «Іскры вечнага агню». Прагучалі ваенныя песні ў выкананні Т. А. Гурыш, А. М. Сыча.

Дзівінскі філіял, 32 чал.

***12 ліпеня***

Творчая лабараторыя работнікаў публічных бібліятэк прайшла пад назвай «Проектная деятельность: от замысла к воплощению». Галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі прааналізавала вынікі працы ГУК за 1 паўгоддзе 2019 года. З выступленняў спецыялістаў аддзела бібліятэчнага маркетынгу прысутныя даведаліся, як правільна скласці і аформіць праекты сваіх бібліятэчных устаноў. Бібліятэкары праслухалі інфармацыю пра работу бібліятэкі ў сацыяльных сетках. Загадчыца Гарадзецкага філіяла і бібліятэкар Імянінскай публічнай

бібліятэкі падзяліліся з калегамі ведамі, атрыманымі на абласных курсах павышэння кваліфікацыі. Падчас другой часткі мерапрыемства жадаючыя змаглі асвоіць і ўдасканаліць свае навыкі па сканіраванню дакументаў.

ЦБ, 54 чал.

***14 липеня***

На пасяджэнні клуба сямейнага чытання, пазнавальным часе «Чтоб хорош был урожай, эти книги выбирай» ішла гаворка аб леках з агарода, хатнім кансерваванні, хатніх нарыхтоўках. Выслухалі меркаванні і парады па вядзенню садова-агародных работ Курач В. А., прагледзелі відэапрэзентацыю па агародніцтву і хатняму кансерваванню. Прапанавана віктарына «Во саду ли, в огороде». Арганізавана кніжная паліца «Азбука огородника». У канцы сустрэчы кожны з прысутных атрымаў брашуры з рэцэптамі нарыхтовак.

Шамятоўская ПБ, 33 чал.

***20 ліпеня***

Цэнтральная раённая бібліятэка ўдзельнічала ў святкаванні Дня горада Кобрына, прадставіўшы польскую кухню на пляцоўках нацыянальных культур «В хороводе друзей» у парку імя А. В. Суворава. Да бібліятэкараў далучыліся госці з Польшчы – спявачка Барбара Драздзінская і ансамбль «Акорд».

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81